



Рух за свабоду





Горацкая газета

№24

7 чэрвеня 2007

# УзГорак

Кошт свабодны



# А без горячей без воды и ни туды, и ни сюды

### НА СЕДЬМОМ ГОДУ XXI ВЕКА ГОРКИ НАКОНЕЦ ВЫШЛИ ИЗ РЕЖИМА "ЧРЕЗВЫЧАЙНОГО ПОЛОЖЕНИЯ"

**Дать городу ежедневную горячую воду обещало не одно поколение директоров Центральной котельной, а впоследствии – "Тепловой энергетики". И вот наконец – свершилось! Придя домой вечером, мы теперь ежедневно имеем возможность смыть с себя июньскую жару, не бегая из кухни в ванную с нагретым чайником. По нашим сведениям, "Тепловая" наконец запустила газопоршневую установку и горячая вода будет подаваться в квартиры ежедневно.**

В столь любимых ранее властью, но в последнее время как-то подзабытых "Социальных стандартах" по этому поводу сказано, что горячая вода, дескать, и должна подаваться каждый день, а в исключительных случаях – не менее двух раз в неделю. И то обстоятельство, что тепловики наконец вывели нас из режима "чрезвычайного положения", безусловно радует. Подробности начальство этой организации "выдавать" не желает, но поскольку кроме господ Трухана и Козлова на ниве теплообеспечения в Горках трудятся сотни других людей, узнать кое-что все же удалось.

Во-первых, летом перебои с горячей водой все-таки будут. Но сетовать тут особо-то не приходится – есть необходимость в ремонте сетей. Другое дело, что менять какую-либо трубу можно и день, и месяц – известно, что сие зависит не столько от коммунального энтузиазма, сколько от финансирования.

Во-вторых, труба, как и палка имеет два конца и получив удобства, гражданам придется их оплачивать. Как сообщили специалисты, оплата соответствующей графы в жировке увеличится пропорционально. Коекому такой всплеск квартплаты может оказаться и вовсе не по карману. Но не обрезать же трубу, подающую воду в жилище!

И тут наступает в-третьих.

Уж сколько раз твердили миру, что установка индивидуальных счетчиков – есть благо и оплата по их показаниям бывает гораздо более низкой, чем если ее начисляют по нормам, когда потреблял ты ту воду, или не потреблял - плати. Наконец решение об установке приборов учета холодной и горячей воды в каждой квартире было принято на государственном уровне. По данным людей, хорошо разбирающихся в этих вопросах, те из жильцов, кто сейчас установит счетчики в своих квартирах, увеличения оплаты за горячую воду практически не почувствуют. Как показывает практика, квартиросъемщики, пользующиеся счетчиком, платят примерно на 40 процентов меньше. А если учесть и экономию денег на холодной воде, то, поставив два счетчика, вы можете даже уменьшить свои расходы на "коммуналку".

Чтобы установить приборы учета в своей квартире, необходимо позвонить по телефону 60 00 5, или 5 03 14. Ваша заявка будет принята и в согласованные сроки сотрудники "Тепловой" выполнят необходимую работу. От вас требуется доступ в квартиру, а также – к проходящим по санузлу трубам. Если же они, к примеру, заложены плиткой, то лучше снять ее самим. Это может сделать и слесарь, но сами вы, скорее всего будете аккуратнее и обойдетесь минимальными потерями.

Стоит это удовольствие 147 тысяч, которые можно будет выплатить частями за три месяца. Останется завести блокнот, взять калькулятор, и подсчитать, за какой срок затраты окупятся и вы начнете получать прибыль от снижения коммунальных выплат. Если, конечно, к зиме они снова не подорожают.

*Иван МОРОЗОВ*

## ПЯТАЯ КАЛОНКА

**Из всех праздников и знаменательных дат, пришедшихся на будущую неделю, мы выделили один – День национального флага США. И хотя среди читателей нашей газеты граждане этой страны составляют, пожалуй, меньшинство, мы все же решили по традиции отметить сей знаменательный день, опубликовав в этот раз на своих страницах**

### АНЕКДОТЫ ОБ АМЕРИКАНЦАХ

Американский миллиардер, охнув, хватается за сердце и тревожно говорит своему помощнику:

- Роджер, поскорее купите какуюнибудь приличную больницу. У меня, кажется, инфаркт

Американская кинозвезда рассказывает подруге:

- Представьте себе, мне пришлось на некоторое время отложить свадьбу с Гарри.

- Почему?

- Я выхожу сейчас замуж за Фрэда.

Англичанин и американец вместе, подходят к лифту:

- Прошу вас, сэр, - говорит американец, - пройдемте в "elevator" (лифт по-американски).

- Сэр, - отвечает англичанин, - эта штука называется "lift" (лифт по-английски).

- Ну как же? Ведь лифт изобрели в Америке!

- Может, вы будете утверждать, что и английский язык изобрели в Америке?!

По просьбе сексуальных меньшинств в США после розовой купюры в 20 долларов по соображениям будет пущена в обращение голубая в 50.

В рекламных брошюрах турагенств России появилась "Полезная рекомендация для тех, кто отправляется в США" Внимание!!! Во избежание конфликтов и неприятностей с американскими властями, лицам, владеющим русским языком, настойчиво рекомендуется ЗАБЫТЬ и НЕ УПОТРЕБЛЯТЬ в публичных местах выражение "будь он(я, ты) не ЛАДЕН", а также очень популярное в русском языке слово "ЛАДНО"

Поспорили как-то два араба, кто с закрытыми глазами на Боинге между двух небоскребов пролетит...

## ТРЕБУЮТСЯ НА РАБОТУ

**РАЙБОЛЬНИЦА:**
Санитар морга, з/п 300-350 руб.
**ДЕТСАД Д.СОВА**
Срочно – воспитатель на подмену отпусков. Проезд оплачивается.
**АЛЬФА-ЗЕТ**
Рабочие строительных специальностей, разнорабочие
**МП РОС-МОДЕРН**
Портные, закройщики
**ОАО "СТРОИТЕЛЬ"**
Рамщики
Каменщики
Электрогазосварщик
Электрик
Штукатуры
**ОАО "ПРИМА"**
Мастер деревообработки, станочники
**БГСХА**
Столяры в корп. 3, 4.
Электрогазосварщик, электрик, бульдозерист
**УЗЕЛ ПОЧТОВОЙ СВЯЗИ**
Почтальоны, оператор связи
**АТП-17**
Водители категории Д
**ОАО "ПРЕМА"**
Контролер КПП
**ДРСУ-217**
Электромонтер

*По данным Центра занятости. Тел. 5 44 40*

*Мнение экономиста*

# Горячая пора. Или раздумья о статистах

Начало лета для нашего сельскохозяйственного региона – всегда наиболее ответственная и горячая пора. Длинный день позволяет проводить в короткие сроки большой объем работ. Но сейчас "жару" задают и так называемые внешние обстоятельства. Именно к ним можно отнести ограничения на импорт мяса из нашей страны, введенные Россией, о которых мы писали ранее. На протяжении последних месяцев наши чиновники от сельского хозяйства обещали, что эта проблема будет решена в ближайшее время в рабочем порядке. Но время идет и поданным на середину мая, на складах уже лежит около 18 тысяч тонн нереализованной мясной продукции. И хотя в конце мая российские ветеринары позволили еще 12 белорусским мясоперерабатывающим предприятиям продавать свою продукцию в Россию, но Могилевщина в этом списке не представлена. Отсюда и проблемы, возникающие у наших сельхозпроизводителей, поскольку трудности, возникшие у мясокомбинатов, не позволяют им сегодня кредитовать в былых объемах наших поставщиков скота. И перспективы здесь довольно тумааные, поскольку если уж Россия взялась защищать свой рынок, то ограничить свои поставки туда (как это было с сахаром) нам, безусловно, придется. А вслед за этим – сокращать производство. Есть, конечно, и другой путь: приватизировать с участием россиян наши перерабатывающие предприятия и тем самым создать там собственное лобби.

Именно этим путем пошли сейчас горецкие власти, которые пытаются в последнее время провести приватизацию на почти обанкроченном маслосырзаводе. Но эта попытка также имеет две стороны медали. Да, с одной стороны на наше предприятие придет инвестор с собственной товаропроводящей сетью, опытом работы на огромном российском рынке, новыми стандартами качества. Это момент положительный. Но с другой стороны встает вопрос: А где отечественные инвесторы? Где собственные "Вимбилль-даны", "Даноны" и "Эриманы"? Попытки приватизировать и, соответственно, дать вторую жизнь Горецкому, да еще и некоторым другим заводам мясо-молочной отрасли предпринимаются в нашей стране давно и регулярно, но также регулярно они почти всегда оканчиваются ничем. А там, где приватизация все же состоялась, результаты деятельности предприятий значительно улучшились. Поэтому складывается впечатление, что наши власти, что есть сил "борются" за предприятия, и только когда те приближаются к краху и что с ними делать, становится непонятным, отваживаются на приватизацию.

В нашем случае ситуация выглядит следующим образом. Еще лет десять назад горецкий МСЗ был довольно успешным и прибыльным предприятием. Во время акционирования часть акций выделили колхозам и совхозам района, часть приобрели люди за чеки "Имущество", часть приобрели фирмы, а еще часть осталась за государством (не контрольный пакет). Был избран Совет акционерного общества, созданы все положенные при этом органы. Но когда на собраниях акционеров собственники начинали решать конкретные вопросы: поднять закупочную цену на молоко, кого назначить директором, какие дивиденды по акциям выплачивать, как вообще развивать производство, то из Могилевского облисполкома тут же звучала команда "СТОП!" Дескать, вы находитесь в административном управлении вертикали и посему – никакой самодеятельности! Горецкие акционеры, услышав сей грозный окрик, тут же и разбежались по углам. А там, где не разбежались, государство ввело "золотую акцию" – право власти управлять любым предприятием по собственному усмотрению.

Я сам являюсь акционером Горецкого МСЗ, но ни разу ничего не слышал о дивидендах, как, думаю, и много кто из нас, уважаемые обыватели. Получается, что за те десять лет, что вертикаль управляет заводом, наши акции превратились в труху и… никто не виноват. Это вам не Америка, где за такую работу акционеры в более короткий срок разогнали бы любую "вертикаль"! А у нас все тихо. И пусть теперь добрые дяди за копейки продадут завод, и наших (обывательских) акций там станет – кот наплакал, и считаться с интересами простых людей новому собственнику уже будет ненужно. Лишь бы этот собственник оплатил огромные долги, которые наделал завод под мудрым управлением чиновников, да не пришлось останавливать производство.

А мы, уважаемые, обыватели, в эту горячую пору по-прежнему останемся статистами.

*Андрей ЮРКОВ, тел. 623 61 08*

# М.Харашці: "Беларускую сытуацыю трэба цалкам перавярнуць"

**Сёньня ў Менску пачаўся двухдзённы міжнародны сэмінар-трэнінг "Узаемадзеяньне мэдыяў і дзяржаўных прэсавых службаў у дэмакратычным грамадзтве". Яго сумесна зь беларускімі ўладамі арганізуе Бюро ў пытаньнях свабоды мэдыяў АБСЭ. З гэтай нагоды ў Менск зь Вены на адзін дзень прылецеў кіраўнік бюро Міклаш Харашці. Перад пачаткам сэмінару ён даў інтэрвію чатыром журналістам, сярод якіх быў і наш карэспандэнт.**

Чаму тэмай сэмінару абралі ўзаемадзеяньне мэдыяў і прэсавых службаў, а ня іншую праблему — напрыклад, стан недзяржаўных СМІ, якую многія журналісты лічаць значна больш важнай?

Адказваючы на гэта пытаньне, Міклаш Харашці гаварыў пра кампраміс:

"Перамовы паміж маім офісам і беларускімі ўладамі прывялі да таго, што абралі менавіта гэту тэму, прымальную для абодвух бакоў. Мы задаволеныя, што можам паказаць досьвед рашэньня гэтай праблемы ў дэмакратычным грамадзтве. А таксама мы пайшлі так далёка, наколькі цяпер гатовыя ісьці беларускі ўрад у гэтым пытаньні".

Міклаш Харашці паведаміў, што прывез з сабою рэцэнзію на законапраект "Аб інфармацыі, інфарматызацыі й абароне інфармацыі", які сёлета зьбіраецца разглядаць Палата прадстаўнікоў.

Яго вялікія недахопы, падкрэсьлівае прадстаўнік АБСЭ, гэта абавязковае вызначэньне карыстальніка інфармацыяй ды абмежаваньне доступу журналістаў да дзяржаўнай інфармацыі:

"Як правіла, такая інфармацыя павінна быць адкрытай для грамадзтва. І толькі вельмі спэцыфічная частка — закрытай. А гэты законапраект прадугледжвае ўсё наадварот — амаль уся інфармацыя закрытая і зусім мала адкрытага. І мне падаецца, што гэтую сытуацыю трэба цалкам перавярнуць. Тыя моманты, калі грамадзтва ня можа мець магчымасьці доступу да інфармацыі, мусяць быць вельмі вузкімі. І абавязкова прапісаныя ў законе. А не наадварот".

Заўвагі міжнародных экспэртаў Міклаш Харашці сёньня перадаў старшыні парлямэнцкай камісіі ў правах чалавека, нацыянальных дачыненьняў і СМІ Юр'ю Кулакоўскаму.

Спадар Кулакоўскі сказаў нашаму радыё, што задаволены сустрэчай:

"Мы нармальна, памяркоўна абмеркавалі шэраг пытаньняў, якія зьвязаныя з заканадаўствам. Яны далі нам свае прапановы да праекту закону "Аб інфармацыі, інфарматызацыі й абароне інфармацыі". Менавіта да гэтага, а не да праекту закону "Аб друку".

Журналісты чамусьці ўвесь час блытаюць Божы дар зь яечняй — два розныя законы. Распрацоўнікам законапраекту аб СМІ зьяўляецца Міністэрства інфармацыі. А закон аб інфармацыі рыхтуе Міністэрства сувязі".

На сустрэчы ў Палаце прадстаўнікоў Міклаш Харашці не абышоў і дзейнага закону "Аб друку". "Гэты дакумэнт абмяжоўвае дзейнасьць мэдыяў і ўжываецца як сродак пакараньня", — падкрэсьліў прадстаўнік АБСЭ. Ён таксама адзначыў, што асноўная частка незалежных СМІ ўвесь час сутыкаецца з праблемамі друкаваньня, распаўсюду і з рэгістрацыяй юрыдычных адрасоў.

У сваім сёньняшнім інтэрвію прадстаўнік у пытаньнях свабоды мэдыяў АБСЭ выказаў шкадаваньне, што агульная сытуацыя са СМІ ў Беларусі не паляпшаецца.

Намесьнік старшыні Беларускай асацыяцыі журналістаў Андрэй Бастунец лічыць: за два гады, якія прайшлі пасьля папярэдняга прыезду ў Беларусь спадара Харашці, становішча нават пагоршылася:

"Яно пагоршылася прыкладна напрыканцы 2005 году, прыблізна праз паўгоду пасьля таго, як офіс спадара Харашці агучыў рэкамэндацыі для беларускіх уладаў. Становішча зьмянілася пасьля таго, як была выкінутая зь дзяржаўнай сыстэмы распаўсюду большасьць незалежных выданьняў. І з таго моманту сытуацыя не палепшылася".

*Уладзімер Глод*

## ПЯТАЯ КАЛОНКА

### "БРЕСТСКИЙ КУРЬЕР" ВЫЙГРАЎ СПРАВУ Ў СУДЗЕ

Суд Маскоўскага раёну Берасьця сёньня не задаволіў пазову жыхара гораду Леаніда Валабуева да незалежнай газэты "Брестский курьер".

Пазоў аб абароне гонару, годнасьці й дзелавой рэпутацыі паўстаў пасьля публікацыі на гумарыстычнай старонцы "Брестского курьера" вершу "Песнь о Волобуеве".

Берасьцеец Леанід Валабуеў палічыў, што гэты верш прысьвечаны менавіта яму і ўтрымлівае паклёпніцкія зьвесткі. Таму ён запатрабаваў абвергнуць іх, кампэнсаваць маральныя страты 2 мільёнамі рублёў і ануляваць пасьведчаньне аб рэгістрацыі газэты.

Пазьней апошняе патрабаваньне спадар Валабуеў зьняў, але маральныя страты ацаніў ужо на 10 мільёнаў рублёў.

Рэдакцыя "Брестского курьера" даводзіла ў судзе, што "Песнь о Волобуеве" ня ёсьць арыгінальным творам журналістаў газэты і спачатку зьявілася ў інэрнэце і ў адным з расейскіх часопісаў. Такім чынам, рэдакцыя ня можа адказваць за зьвесткі, якія раней распаўсюдзілі іншыя сродкі масавай інфармацыі.

Акрамя таго, прадстаўнікі газэты "Брестский курьер" абверглі ў судзе высновы Леаніда Валабуева — той меркаваў, што ў яго вельмі рэдкае прозьвішча, і таму верш-пародыя прысьвечаны менавіта яму.

Паводле афіцыйнай даведкі, на Берасьцейшчыне 23 асобы маюць такое прозьвішча.

*Радыё Свабода*

## Курсы валют на 7 чэрвеня

| | Аграпрамбанк | Беларусбанк | Белінвестбанк | Нацбанк | за тыдзень |
|---|---|---|---|---|---|
| Даляр ЗША | 2140-2160 | 2135-2165 | 2135-2160 | 2146 | +1 |
| Еўра | 2870-2970 | 2840-2960 | 2880-2940 | 2901,50 | +18,08 |
| Расейскі рубель | 80-83,8 | 78,5-84 | 78-84,5 | 83,12 | +0,31 |
| Грыўна | 380-480 | 360-440 | 350-450 | 426,43 | +0,37 |
| Ангельскі фунт | | 390-4300 | | 4274,30 | +30,31 |
| Злоты | 660-780 | 670-770 | | 758,73 | +5,66 |

Радыё "Свабода"

# Летнія ініцыятывы апазыцыі

**Першы творчы конкурс для прыхільнікаў дэмакратычных зьменаў абвясьціла незарэгістраваная грамадзкая арганізацыя "Рух за свабоду". Паводле ўмоваў, кожны ахвочы можа паспрабаваць сябе ў якасьці рэжысэра – зьняць ня больш як 10-хвілінны відэафільм на тэму "Беларусь, якую не паказвае БТ" (Беларуская тэлевізія). Пра новыя ініцыятывы апазыцыі ў летні пэрыяд сьведчаць таксама паведамленьні АГП, БНФ, БСДП (Грамада).**

Каштоўныя падарункі абяцаныя ўдзельнікам і пераможцам конкурсу, які стартуе ад сёньня. Доўжыцца ён будзе да 20 ліпеня, а ўзнагароджваньне заплянаванае на 27 ліпеня. Пра намеры й спадзяваньні арганізатараў – Юлія Коцкая:

"Мы разьлічваем на альтэрнатыўную інфармацыю той, што дэманструе БТ. Да таго ж, гэты відэаматэрыял могуць здымаць людзі абсалютна рознай палітычнай, прафэсійнай, рэлігійнай і іншай прыналежнасьці. Акрамя таго, што інфармацыя будзе альтэрнатыўнай, каштоўнасьць яе вызначыць таксама рознабаковасьць".

Юлія Коцкая паведаміла, што відэастужкі да 10 хвілінаў удзельнікі конкурсу загружаюць на відэасэрвіс YouTube.com. Спасылкі й кантакты – на электронны адрас info@milinkevich.org .

А.Мілінкевіч: "Рух "За свабоду" далучыць дадаткова людзей"

Старшыня "Руху за свабоду" Аляксандар Мілінкевіч характарызуе прэзэнтацыю конкурсу як пачатак шматлікіх дзейных справаў:

"Формы дзейнасьці вельмі розныя будуць. Пачынаем вельмі моцна займацца адукацыяй. Стажыроўкі будуць у розных краінах. Па-ранейшаму будзем абараняць рэпрэсаваных. Гэта адна з галоўных справаў, каб разбурыць страх. Наш "Рух за Свабоду" далучыць дадаткова людзей. У гэтым галоўная мэта".

Ф.Вячорка: "Пікеты адбудуцца цягам усяго лета"

Пра летнія ініцыятывы Беларускага народнага фронту і яго моладзевага крыла паведамляе Франак Вячорка:

"Падаем заяўкі на пікеты, якія адбудуцца цягам усяго лета. 6 чэрвеня – пікетаваньне цэнтральнага корпусу БДУ, 14 – пікетаваньне Камароўскага рынку. Цягам трох месяцаў моладзь будзе знаходзіцца ў тых гарадох, дзе вынішчаюць гістарычную архітэктуру. Мы рыхтуемся – Фронтам – да 27 ліпеня".

І.Шынкарык: "Пройдуць акцыі й пікеты "Скажы Лукашэнку: "Не!"

Партыя камуністаў Беларуская, Беларуская сацыял-дэмакратычная партыя (Грамада) і Аб'яднаная грамадзянская партыя праводзяць напачатку лета кампанію ў абарону захаваньня ільготаў для насельніцтва. Каардынатар акцыі Ігар Шынкарык:

"1 чэрвеня прайшлі пікеты ў Бярэсьці й Горадні "Скажы Лукашэнку "Не!" Плянуем зрабіць шэраг такіх інфармацыйных кампаній і пікетаў. Будзем тлумачыць насельніцтву, што губляе нават шараговы чалавек ці пэнсіянэр са скасаваньнем гэтых сацыяльных гарантыяў".

*Вячаслаў Кулік*

## Каспараў: Падзеньне Пуціна дапаможа беларусам, падзеньне Лукашэнкі – нам

**У Празе падчас канфэрэнцыі "Дэмакратыя і бясьпека" адбылася сустрэча аднаго з лідэраў беларускай апазыцыі Аляксандра Мілінкевіча з кіраўніком руху "Іншая Расея" Гары Каспаравым. Пасьля сустрэчы Каспараў адказаў на пытаньне карэспандэнта нашага радыё: ці абмяркоўваліся падчас размовы супольныя дзеяньні расейскай і беларускай апазыцыі?**

Каспараў: "Яны маюць свае праблемы, падобныя на нашыя. Як сумна жартуюць многія расейцы, "наш цягнік хутка набліжаецца да станцыі Менск". Сапраўды, падзяліцца нэгатыўным досьведам карысна, але ў той жа час мы разумеем, што змагаемся з рознымі рэжымамі. Аднак я мяркую, што падзеньне пуцінскага рэжыму дапаможа ім, гэтак жа, як падзеньне рэжыму Лукашэнкі дапаможа нам".

*Радыё Свабода*

## БУШ ДЗЯКУЕ ЧЭХІІ ЗА ПАДТРЫМКУ ДЫСЫДЭНТАЎ У БЕЛАРУСІ І НА КУБЕ

**Пасьля сёньняшніх перамоваў з кіраўніцтвам Чэхіі прэзыдэнт ЗША Джордж Буш высока ацаніў дзеяньні чэскіх уладаў, якія разам са Злучанымі Штатамі падтрымліваюць іншадумцаў у Беларусі і іншых краінах сьвету.**

Паводле ягоных словаў, Чэская Рэспубліка такім чынам дае ім шанец адчуць перавагі дэмакратыі і вольнага грамадзтва:

"Мы хочам працаваць разам зь іншымі, каб данесьці перавагі свабоды да тых, хто не мае. Дзякуй вялікі ўраду Чэхіі за падтрымку тых, хто ня мае магчымасьці выказвацца ад свайго імя -- ці гэта іншадумцы ў Беларусі ці на Кубе," -- заявіў Джордж Буш.

*Радыё Свабода*

## ПЯТАЯ КАЛОНКА

### ГАИ

За неделю с 28.05. по 3.06. в районе задержаны 8 пьяных водителей. Всего же нарушений ПДД было зафиксировано 101. Скоростной режим нарушили 39 водителей. Привлечены к ответственности 4 пешехода.

### НЕ ВПИСАЛИСЬ...

Двое пьяных водителей разбили свои машины, по той причине, что им не хватило отведенного для движения пространства. В одном случае на закруглении дороги в месте, где ул.Бруцеро-Ерофеевская переходит в просп.Интернациональный, превысивший скорость нетрезвый лихач врезался в столб в том месте, где ожидают автобуса уезжающие на Ленино. Еще одна авария произошла в районе Конно-спортивной школы. Там автомобиль "Пежо" съехал в кювет и опрокинулся.

К счастью, оба пострадавших (они же – нарушители) отделались ушибами.

### ПРОВЕРЬТЕ ВАШИ ВЫХЛОПЫ

В Горецком районе начата очередная операция "Чистый воздух". ГАИ напоминает, что для карбюраторных автомобилей содержание СО в отработанных газах не должно превышать 1,5%. Для инжекторных – 1%. Норма содержания СН – 1200 ед.

### ПОСТАВЬТЕ МАШИНУ НА СТОЯНКУ.

Участились случаи краж из оставленных на ночь автомобилей. Крадут в основном колеса и магнитолы. ГАИ напоминает, что легче всего обеспечить сохранность автомобиля, поставив его в гараж, или на стоянку. Кстати, к двум имеющимся стоянкам в нашем городе скоро прибавятся еще две – возле стадиона и на ул.Строителей.

### НЕ ЗАБЫВАЙТЕ ПРО ДЕТЕЙ

Хотя сейчас светлое время суток длится долго, однако, уехав на отдых в деревню, детишки часто гуляют там допоздна, возвращаясь домой в темноте. Чтобы не подвергать их опасности, не забывайте про световозвращающие элементы на одежде. Да и самим подросткам нужно помнить – собрался "на танцы" в соседнюю деревню, прихвати с собой фликер – при позднем возвращении пригодится.

## МЕЖДУ ДЕЛОМ

Некий посетитель райисполкома, видимо в промежутке между решением там каких-то серьезных вопросов, заглянул в оставленный без присмотра кабинет и прибрал к рукам подвернувшийся кошелек с деньгами (около 200 тыс.) и банковской карточкой. Правда, далеко не ушел – поймали.

## РЕБЕНОК – НЕ ОХРАНА

На ул.Калинина из детской коляски был похищен кошелек с небольшой суммой денег и двумя карточками.

## ПОКАТАЛСЯ

Пьяный житель г.Горки, очевидно в поисках острых ощущений, угнал грузовик, принадлежащий одному из СПК нашего района. Угонщик установлен. Возбуждено уголовное дело.

## И В ДРИБИНЕ ВОРУЮТ

В Горецкий РОВД обратилась гражданка, принимавшая участие в Дрибинском районном турслете. Женщина пожаловалась на пропажу из рюкзака мобильного телефона. В ходе проверки выяснилось, что пока спортсмены преодолевали препятствия, некто сумел основательно "почистить" их вещи в лагере – еще у нескольких туристов пропали деньги. Материалы направлены в Дрибинский РОВД.

## "УЛОВ" НЕ ПОШЕЛ НА ПОЛЬЗУ

На одном из озер Горецкого района двое молодых людей "гуляли" на природе. А поскольку денег на пикник "по полной" не хватило, то гуляки прибегли к простому способу – отобрали у подвернувшегося под руку подростка серебряную цепочку, которую намеревались пропить. При этом, для убедительности побили и мальчишку и его спутника. На этом гулянка превралась – "крутые парни" арестованы и им теперь светит ст.206 "Грабеж".

## СЕРИЙНЫЙ ВОРИШКА

При проверке заявления, поданного студентом БГСХА о пропаже в общежитии мобильного телефона, выяснилось, что таким же образом пострадали и еще четверо его коллег. Установлен и вор – такой же студент из того же общежития.

Погода

## МАЙСКИЕ ПАРАДОКСЫ

Начало и конец мая удивили даже привыкших к погодным аномалиям синоптиков. До рекордов, правда, не дошло. Ударивший в Праздник весны и труда морозец в 2,1 градуса (помните, тот – со снегом) был поменьше, чем рекордный (-4,4), случившийся 8.05.53. Но тогда замерзло под утро, на пару часов, а нынче "филиал зимы" продержался на градуснике целый день.

Пролившийся над горками 29-го мая ливень, также не был рекордным, но 28 мм. осадков за несколько часов, при норме 55 мм. все равно – много. Хотя трудно представить, что 31 мая 1951-го года этот месячный план был практически выполнен природой за сутки – 54 мм.

А вот последняя декада мая рекорд все же поставила, став самой теплой за все время наблюдений (с 1881-го года). Средняя температура за эти дни составила +24,4. Это на 7 градусов выше среднего показателя и аж на 10 теплее, чем в прошлом году.

По температуре, в отличие от Москвы и Минска, горецкий рекорд устоял, не дотянув до "тридцатника" каких-то 0,6 градуса (27.05). Самая же теплая погода в мае была зафиксирована у нас 23.05.1912. +30,9.

В среднем же прошедший месяц выдал +14,2 градуса при норме 12,4. Осадков за весь месяц выпало 78 мм (максимум был в мае 1932-го года – 147,8).

Июнь ожидается теплый. Первая декада прогнозируется на 4 градуса теплее обычного, что пока подтверждается. А вот за месяц температуру обещают всего на полградуса выше нормы. Но это еще предварительно.

*Иван МОРОЗОВ*

## ЖЕЛЕЗО ЛЕЗЕТ ИЗ ЗЕМЛИ

Возле д.Сова обнаружены три гранаты времен Великой Отечественной войны. Прибывшие саперы произвели необходимые действия и уничтожили опасную находку.

## КОМУ ОТОМСТИЛ?

В одной из деревень мужчина, поругавшись с женой, "назло" супруге выпил полстакана ядохимиката. Пришлось спасать, что было сделано успешно.

# Магілёў: затрыманыя падчас пікету актывісты — на волі

**Моладзевыя актывісты Аляксандар Анісімаў ды Аляксандар Шарабурка прабылі ў пастарунку Ленінскай управы ўнутраных справаў блізу двух гадзінаў. На актывістаў завялі адміністрацыйную справу па факце выкарыстаньня незарэгістраванай сымболікі.**

Паводле Аляксандра Анісімава, матэрыялы адміністрацыйнай справы перададуць у адміністрацыйную камісію.

Аляксандра Анісімава ды Аляксандра Шарабурку затрымалі на пікеце супраць адмены ільготаў за спробу разгарнуць бел-чырвона-белы сьцяг.

Пакуль праходзіў пікет актывісты знаходзіліся пад пільным наглядам міліцыянтаў. Па сканчэньні пікету іх даставілі ў пастарунак.

*Радыё Свабода*

Финал

# Прощеный вторник

**Кубок района по футболу. Финал. 6 июня. Городской стадион. 80 зрителей. Время игры – 2х40. БГСХА – Сборная школьников – 2:1(1:1) Судьи: Е.Манаев, Э.Старнадкин, А.Латышев БГСХА: Гулев, Высоцкий, Лихачев, Гарапучик, Шерстнев, Куртин, Молли, Ильяшенко, Босяков, Шестернев Школьники: Зосимов, Матюхин, Никульников, Михеев, А.Веренич (Яковцов), Болбас, Махрачев, Портянкин (Латышев), Шароин (Кухорев), Н.Веренич, Чепиков Голы: 0:1- Н.Веренич, 1:1 – Гарапучик, 2:1 – Босяков.**

Для зрителей финал получился удачным. На поле хватало острых моментов, нешуточной борьбы, и... взаимного "прощения" – в том смысле, в каком это слово понимают в футболе.

Уже в первом тайме Веренич-младший дважды выскакивал один в один с академическим вратарем. В первом случае нападающий, похоже, хотел сыграть в духе "фэйр плэй", уступив мяч вылетевшему навстречу Гулеву, но пожалуй сделал это напрасно – расстояние до голкипера давало шанс оказаться на мяче первым. Во втором моменте Николай "простил" соперников, обыграв на рывке защитника и обведя вратаря – удар пришелся впритирку со штангой.

Трижды за первый тайм "прощали" и школьников – реверансы в виде попадания в штангу сделали матч еще более зрелищным. Однажды в "обряде прощения" поучаствовал и судья – момент, когда игравший вверху Лихачев получил удар в лицо, должен был завершиться пенальти.

Счет открыл все же настырный Веренич. В очередной раз прорвавшись к линии штрафной, нападающий, у которого была возможность продвигаться дальше, неожиданно мощно пробил в ближнюю девятку. Академическая команда сравняла результат со штрафного. Зосимов правильно прикрыл стенкой ближний угол, но сам позицию выбрал неудачно, продвинувшись излишне вперед, и пущенный Гарапучиком от угла штрафной мяч нашел свое место в дальней "паутине".

После перерыва преимущество, несмотря на удаление игрока, имели студенты. Школьники явно подсели физически, однако несколько раз огрызнулись опасными контратаками, сбиваясь, правда, в центр и тем самым сужая пространство для маневра своему лидеру. Особенно грешил этим Чепиков – любитель побегать с мячом и поводиться. Тем не менее, рискну предположить, что в воротах от него пользы было бы больше. Решающий гол вытек из количества атак БГСХА. В середине тайма вратарь школьников, пытаясь подобрать "подаренный" соперником мяч, вроде все сделал правильно, однако его громкое "Я!" проигнорировали защитники. Возникла секундная пауза, которой воспользовались студенты, закатив мяч в опустевшую рамку.

Кульминация, согласно законам Кубка наступила за пару минут до свистка. Вошедшему в штрафную Н.Вереничу заплели ноги и судья справедливо указал на точку. Пробивать рискованно взялся сам пострадавший, хотя по неписанным законам этого делать нельзя – эмоции в таких случаях обычно мешают. Так и вышло – последовало очередное прощение (мяч прошел мимо) и предвкушающие серию пенальти зрители разочарованно развели руками.

*Иван МОРОЗОВ*



Практика проведения матчей без присутствия медработника когда-нибудь до добра не доведет.



Решающий момент матча. Вратарь ушел в один угол, мяч – мимо другого.



Академические "звезды" явились на стадион, когда матч уже начался.



Заслуженный трофей.

ПЯТАЯ КАЛОНКА

## СТАРТУЕТ ЧЕМПИОНАТ ОБЛАСТИ

В субботу, 9-го июня команда нашего района примет старт в очередном чемпионате области. Как сообщили в областной федерации футбола, в этом году кроме Горок борьбу будут вести десять команд, представляющие Чериков, Вейно, Краснополье, Чаусы, Кричев, Белыничи, Шклов, Кировск, Осиповичи.

Система розыгрыша предельно проста – два круга с разъездами. Первый матч наши проведут в Черикове. А на домашнюю встречу любителей футбола пригласят 17-го июня. В этот день к нам приедут Белыничи.

*Иван МОРОЗОВ*

## НАКАНУНЕ КУБКА ЕВРОПЫ

В Пинске первого и второго июня проведены соревнования на Кубок страны по легкой атлетике. Главной задачей соревнования был отбор в мужскую и женскую команды для участия в Кубке Европы, который пройдет в Италии (мужчины) и Германии (женщины). Белорусскую сельхозакадемию представляли 5 человек.

Золотые медали завоевали А.Козловский (Бухфак) – 400м с/б, результат – 50,61 и Ю.Белов (Агрофак) – толкание ядра, 19м. 80 см.

Андрей Козловский завоевал еще одно первенство – в эстафете 4х400 в составе команды Витебской обл.

Третье место занял С.Козлов (Бухфак) – на дистанции 400м.

Все четверо примут участие в стартах Кубка Европы. Ждем успехов!

*Иван МОРОЗОВ*

# Встреча поколений

## В БГСХА ПРОШЕЛ РЕСПУБЛИКАНСКИЙ ТУРНИР ПО СТРИТБОЛУ

Выпускники БГСХА, особенно спортсмены, не забывают свою "альма-матер". И если те, кто активно не занимался спортом, в большей мере посещают ее в юбилейные даты, то спортсмены – еще и по случаю проведения различных турниров. Недавно такой случай представился им снова. Впервые в Горках проводился турнир по стритболу (разновидности баскетбола), в котором приняли участие 12 команд. Были среди участников и выпускники БГСХА разных лет, в настоящее время работающие ведущими специалистами в разных городах и селах Беларуси. Целью проведения соревнований была популяризация и развитие баскетбола в нашем регионе.

В составе двух команд Минска выступали бывшие студенты: А.Новицкий (Агрофак), Д.Гуторов (Землфак), В.Короткевич (Бухфак), Ю.Шалковский (Экфак). Витебск представляли выпускники Землфака П.Беляев и А.Толстых. Оршу представляли команды ветеранов и молодежи из общества "Локомотив". За Горки выступали также две команды – студентов и сотрудников Академии. Приятно было видеть на площадке четыре команды школьников города, причем три из них выставила Гимназия. Юные игроки составили неплохую конкуренцию взрослым, а одна из команд Гимназии сумела победить сотрудников Академии.

Игры проводились по круговой системе и за два игровых дня было проведено более 50 встреч. Наилучшую подготовку продемонстрировала команда Орши, выигравшая 10 матчей и оступившаяся только в игре со студентами БГСХА. Набрав 23 очка, оршанцы заняли первое место. Вторыми, одержав девять побед, стали баскетболисты Витебска. Третье место заняла команда студентов БГСХА, в активе которых также 9 побед и 2 поражения, но у Витебска в активе имелись три убедительные победы, за которые по правилам стритбола начисляются 3 очка. Сотрудники БГСХА заняли почетное 6-е место.

В первый день турнира была проведена интересная баскетбольная встреча двух сборных, одна из которых представляла столицу, а другая состояла из игроков Витебска, Орши и Горок. Первый период бескомпромиссной игры выиграла сборная городов Беларуси со счетом 23:20, второй был на стороне столичных баскетболистов – 21:14. Третья четверть вновь принесла успех сборной – 21:13. Не уступили "провинциалы" и в последнем периоде, победив с общим счетом 73:72. Лучшими игроками встречи были в составе команды Минска: А.Новицкий (23 очка), Д.Гуторов, Ю.Шалковский. В составе сборной выделялись своей игрой П.Беляев (Витебск), В.Маршалов (Орша), Ю.Аляпин (Горки).

Лучшие команды и участники получили грамоты и сувениры от организаторов. В будущем турнир станет традиционным.

*Владимир ПЕТРОВ, судья Национальной категории*

# У чым асаблівасьці сёлетняга цэнтралізаванага тэставаньня?

На цэнтралізаванае тэставаньне, якое праводзіцца ў буйных гарадах Беларусі, і паводле вынікаў якога можна паступіць у навучальныя ўстановы, запісаліся больш за 200 тысяч чалавек. Цэнтралізаванае тэставаньне праводзіцца ў Беларусі вось ужо трэці год запар. Многія выкладчыкі скептычна ставяцца да такога.

З 200 тысяч абітурыентаў студэнтамі стануць толькі 30 тысяч

Сёлета тэставаньне пройдзе з 12 па 28 чэрвеня па 14 прадметах. Зарэгістравалася больш за 200 тысяч чалавек (летась – 170 тысяч). Павялічылася і колькасьць ВНУ, якія набіраюць студэнтаў толькі па выніках тэставаньня (цяпер іх 43 з 53-х). Выключэньне – некаторыя спэцыялізаваныя ВНУ: Акадэмія мастацтваў, Акадэмія музыкі, Акадэмія МУС, Вайсковая акадэмія, Гомельскі інжынэрны інстытут Міністэрства надзвычайных сытуацыяў.

Абітурыенты маюць права прайсьці толькі тры тэсты: абавязкова па беларускай альбо расейскай мовам і па двух іншых профільных прадметах па выбару.

Максымальная колькасьць балаў – 100. Нездавальняючай адзнакай для ўсіх прадметаў прызнаецца з 1 да 14 балаў уключна, з такім баламі дакумэнты ў ВНУ не прымуць.

З гады таму цэнтралізаваная тэставаньня было ўведзеная з ініцыятывы Міністэрства адукацыі. Мэта – аб'ектыўна ацаніць веды.

Аб'ектыўнасьць, веды альбо ўдача, шанцаваньне?

Меркаваньне выкладчыцы матэматыкі Беларускага дзяржаўнага ўнівэрсытэту інфарматыкі і радыёэлектронікі Людмілы Майсені:

"Я толькі кажу пра матэматыку, і гэта ідэя мне імпануе. Таму што тое, як здаваліся экзамэны пры паступленьні ў ВНУ, мы з вамі праходзілі. Там многае залежала ад капрызаў, настрою выкладчыка. Але ідэя патрабуе, безумоўна, яшчэ шліфоўкі. Але ёсьць нюансы, якія не падабаюцца. Тыя, хто паступае на матэматычны факультэт, павінны ўмець даказваць тэарэмы. То бок сыстэма яшчэ не адладжаная. А сама ідэя нядрэнная".

Настаўнік матэматыкі Івянецкай сярэдняй школы Іван Вальчэўскі думае інакш:

"Тэставаньне – гэта сыстэма ўгадваньня адказаў. Нават тыя, хто паступае на матэматычныя спэцыяльнасьці, угадаў некалькі адказаў – паступіў. А потым веды аказваюцца тупіковыя".

Тэст па гісторыі – "халява для троечніка і зубрылы"

Летась я размаўляла адразу пасьля пісьмовага тэсту па гісторыі Беларусі з выпускнікамі ліцэю БДУ. Яны назвалі тэст "халявай для троечніка і зубрылы". Трэба было выбраць адзін правільны адказ з трох. Ацэньвалася не ўменьне мысьліць, разважаць, аналізаваць, а тое, як чалавек "вызубрыў" падручнік з датамі. Так казалі ўдзельнікі леташняга цэнтралізаванага тэставаньня.

Па камэнтар мы зьвярнуліся да выкладчыка філязофіі Магілёўскага дзяржаўнага ўнівэрсытэту імя Куляшова Аляксея Бацюкова:

"Тут вельмі складаная сацыяльная сытуацыя, калі вельмі шмат пагрозаў, і ад іх адным шчытом не абаронісься. Ёсьць, канешне, праблема хабарніцтва, залічэньня студэнтаў па сваяцкіх сувязях... А з другога боку, чалавек вельмі творчы, які мае свае, спэцыфічныя, але надта карысныя і для прафэсіі, і для сваёй спэцыялізацыі, і наагул, для грамадзтва веды, якасьці – такі чалавек ня пройдзе".

Асабліва наракаюць на тэставаньне па гуманітарных дысцыплінах, дзе чалавек павінен ўмець разважаць, аналізаваць. Распавядае Людміла Майсеня:

"Учора давала інтэрвію загадчыца катэдры ангельскай мовы БДУ. Яна казала, што дзеці тэсты прайшлі, а яны "нямыя"! Размоўнай мовы няма, а іх вучыць на факультэце міжнародных адносінаў. Па факту мовы ў іх няма, таму што "натасканьне" пастаўлена на тэсты, а не на размоўную мову, якая неабходна".

Кур'ёзы тэставаньня

Летась у Менскі мэдунівэрсытэт паступіў юнак, у якога ў школьным атэстаце па біялёгіі стаяла двойка. На тэставаньні ён атрымаў 84 балы. Па рускай мове ў атэстаце ў яго было 3 балы, а на тэставаньні – 88. Адзін малады чалавек на ўсе пытаньні выбраў другі варыянт адказу з трох, і атрымаў па гісторыі Беларусі даволі высокі бал, зь якім яго прынялі ў ВНУ. А вось з 98 баламі па ангельскай мове хлопец з Воршы не паступіў на бюджэтнае аддзяленьне Лінгвістычнага ўнівэрсытэту, толькі на платнае...

Праблема ў тым, кажуць чыноўнікі Міністэрства адукацыі ў інтэрвію "Свабодзе", што на гуманітарных факультэты БДУ, Эканамічнага, Лінгвістычнага ўнівэрсытэту было столькі жадаючых паступіць, што не ратавалі нават самыя высокія балы на тэставаньні.

Новае пакаленьне выбірае фізыку і матэматыку

Сёлета сытуацыя зьмянілася, кажа супрацоўнік Рэспубліканскага інстытуту кантролю ведаў Міністэрства адукацыі:

"Сёлета ёсьць станоўчыя зрухі. Калі раней абітурыенты аддавалі абсалютную перавагу юрыдычным спэцыяльнасьцям, эканамічным, то зараз пачынае павялічвацца колькасьць абітурыентаў, зацікаўленых у атрыманьні фізыка-матэматычнай адукацыі".

За правядзеньнем тэставаньня сёлета будзе пільна сачыць Камітэт дзяржкантролю.

Іна Студзінская

# МАП прыме канчатковае рашэньне адносна прэфэрэнцыяў для Беларусі

**7-8 чэрвеня падчас сэсіі Міжнароднай арганізацыі працы (МАП) заплянавана заслухаць "беларускае пытаньне". Будзе агучанае канчатковае рашэньне адносна рэжыму гандлёвых прэфэрэнцый для Беларусі з краінамі Эўразьвязу. Напярэдадні ў Швэйцарыю выправілася ўрадавая дэлегацыя на чале зь віцэ-прэм'ерам Андрэем Кабяковым і намесьніцай кіраўніка прэзыдэнцкай адміністрацыі Натальляй Пяткевіч. У Жэнэве знаходзяцца таксама лідэры Фэдэрацыі прафсаюзаў Беларусі (ФПБ) Леанід Козік і Беларускага кангрэсу дэмакратычных прафсаюзаў (БКДП) Аляксандр Ярашук.**

На падставе фактаў сыстэматычных парушэньняў правоў незалежных прафсаюзаў у Беларусі Рада Эўразьвязу прыняла рашэньне аб выключэньні краіны з Абагульненай сыстэмы тарыфных прэфэрэнцый, якое мусіць набыць моц 21 чэрвеня. Тэарэтычна Беларусь яшчэ можа пазьбегнуць санкцый, калі ўрадавая дэлегацыя на чале зь віцэ-прэм'ерам Кабяковым заявіць пра намер неадкладна пачаць выконваць рэкамэндацыі МАПу. Аднак, як лічыць старшыня БКДП Аляксандр Ярашук, шанцы на станоўчы вынік у гэтай сытуацыі для Беларусі невялікія.

А. Ярашук: "Агіткампанія ФПБ праваліласяʺ

Адной з прычынаў, паводле суразмоўцы – скандал, у эпіцэнтар якога трапіла ФПБ. Напярэдадні прафсаюзнага саміту кіраўніцтва Фэдэрацыі абвясьціла кампанію супраць скасаваньня прэфэрэнцый Радай Эўропы: маўляў, у Беларусі няма парушэньняў правоў прафсаюзаў, а ўсе абвінавачаньні носяць надуманы характар. Потым зьявіліся пісьмовыя звароты да нацыянальных прафсаюзных аб'яднаньняў, а неўзабаве былі пачаты і збор подпісаў. Кампанія азмрочылася заявай старшыні Міжнароднага аб'яднаньня прафсаюзаў мэталістаў Мікалая Шатохіна. 1 чэрвеня ён заявіў, што арганізацыя ня мае ніякага дачыненьня да подпісаў пад дакумэнтамі ФПБ.

"Гэта ўсё нагадвае чэхаўскі сюжэт, калі ўнтэр-афіцэрская ўдава сама сябе высекла ў выніку, – гаворыць Аляксандр Ярашук, – Таму што падбухторылі і абавязалі Фэдэрацыю распачаць гэтую кампанію, канечне, ва ўрадзе (пад урадам мы разумеем ўладу ўвогуле). Натуральна, гэта яны прапісалі абзац аб тым, што ў дзяржаве няма ніякіх парушэньняў правоў, а абвінавачаньні маюць надуманы характар. Не аддаючы тым самым належнага таму, што калі яны ў такім выпадку самі лічаць, што гэта "надуманаʺ, то яны не зьбіраліся і не зьбіраюцца выконваць рэкамэндацыі МАП па-сапраўднаму. Гэта відавочная выснова, якую можа кожны разумны чалавек зрабіць. І вось гэтае глупства, што адбываецца, настолькі дыскрэдытуе і сам урад, і фэдэрацыю, што, з майго глездзішча, хавае апошнія надзеі на тое, што яшчэ можна нейкім чынам пазьбегнуць скасаваньня прэфэрэнцый".

Л.Козік: "БКДП дайшоў да цынізму"

І хоць кангрэс працуе ўжо тыдзень, кіраўніцтва ФПБ на форум да ўчорашняга дня не сьпяшалася. Маё пытаньне – ці магчыма, што "невыязнога" Козіка папросту не запрасілі ў Жэнэву? – выклікала ў кіраўніка афіцыйных прафсаюзаў абурэньне:

"Што? Нас заўсёды запрашаюць, вы дарэмна так, ня трэба так жартаваць. І што ўвогуле з таго, што пачалі працу бяз нас? Што далей?... Значыць, так: Жэнэва працуе да 15 чэрвеня (ад 28 траўня). І калі ехаць і знаходзіцца там тры тыдні, то гэта абсалютна ня мае сэнсу. Гэта могуць такую раскошу сабе дазволіць нашы так званыя... ну, скажам, іншыя прафсаюзы. У іх ёсьць на гэта грошы, камандзіровачныя, ёсьць чым плаціць за гатэль. А мы ня можам сабе такія выдаткі дазволіць. Таму выбіраем тыя кропкавыя моманты, калі трэба там прысутнічаць. І тады я асабіста і буду прысутнічаць".

Усе абвінавачаньні ў махінацыях з подпісамі Леанід Козік абвяргае і кажа, што ініцыятывы ФПБ перасьледуюць адну мэту – клопат пра чалавека працы ды інтарэсы беларускіх прадпрыемстваў:

"Абсалютна няправільна робіць БКДП, калі даходзіць да якогасьці цынізму. Гэта нават не цынізм, а хлусьня, перамешаная з абразай. Я маю на ўвазе, калі яны расказваюць, што гэта мы нібыта па загаду ўладаў робім і г.д. Я, як на духу, магу сказаць: гэта мая прыватная ініцыятыва, асабіста я гэта прыдумаў і ні з кім ня раіўся, таму што мы ніколі ня раімся. Мы – сапраўды свабодная арганізацыя. Мы разгарнулі кампанію і што ўбачылі? Людзі, якія працуюць на прадпрыемствах, бачаць сутнасьць і разумеюць: навошта нам пазбаўляцца грошай? Ідзя ФПБ сыходзіла толькі з аднаго: трэба зрабіць любыя крокі, любыя спробы ўжыць, каб не пазбавіцца гэтых магчымых стратаў. Таму што гэта грошы прадпрыемстваў, гэта ж не мае, не Ярашука, ня ўраду нават грошы. Гэта сродкі канкрэтных прадпрыемстваў, якія пастаўляюць туды прадукцыю".

Паводле падлікаў БКДП, у выніку скасаваньня тарыфных прэфэрэнцый для Беларусі эканоміка краіны будзе штогод недаатрымліваць блізу паўмільярду эўра. Учора намесьнік міністра замежных спраў Андрэй Еўдачэнка заявіў, што ў выпадку прыняцьця рашэньня на скасаваньне прэфэрэнцый Беларусь "будзе вымушаная пыняць сустрэчныя захады датычна прадукцыі з Эўразьвязу".

*Ігар Карней*
*Радыё Свабода*

## ПЯТАЯ КАЛОНКА

### А.МІЛІНКЕВІЧ БЯРЭ ЎДЗЕЛ У КАНФЭРЭНЦЫІ "ДЭМАКРАТЫЯ І БЯСЬПЕКА"

Адзін зь лідэраў дэмакратычнай апазыцыі Аляксандар Мілінкевіч возьме ўдзел у міжнароднай канфэрэнцыі "Дэмакратыя і бясьпека", якая пройдзе ў Празе.

Падчас канфэрэнцыі А.Мілінкевіч пляе сустрэцца з прэзыдэнтам ЗША Джорджам Бушам, прэзыдэнтам Эстоніі Томасам Хэнрыкам Ільвэсам, экс-прэзыдэнтам Чэхіі Вацлавам Гаўлам, міністрам замежных спраў Чэхіі Карлам Шварцэнбэргам, кіраўніком Інстытуту палітычных дасьледаваньняў пры Шалом-Цэнтры - Натанам Шчаранскім, прэзыдэнтам Радыё Свабода Джэфры Гедмінам і іншымі.

Міжнародная канфэрэнцыя "Дэмакратыя і бясьпека" праводзіцца напярэдадні саміту краін "Вялікай васьмёркі". Яе асноўная тэма — падтрымка працэсаў дэмакратызацыі ў краінах з аўтарытарным і таталітарным рэжымамі.

Па выніках канфэрэнцыі будзе прыняты адмысловы "Праскі дакумэнт".

"Сёньня як ніколі востра паўстае праблема абароны правоў чалавека ва ўсім сьвеце. Толькі павага да правоў чалавека, да правоў грамадзяніна, забясьпечвае бясьпеку і стабільнасьць на нашым кантынэнце.

Мы павінны памятаць, што тыя краіны, якія не паважаюць правы сваіх грамадзян, ня будуць паважаць правы іншых народаў. Дзяржаўная палітыка такіх аўтарытарных і таталітарных рэжымаў стварае атмасфэру напружанасьці і дэстабілізацыі ў нашым рэгіёне", — заявіў журналістам Аляксандр Мілінкевіч напярэдадні візыту ў Прагу.

*Радыё Свабода*

### К.ШАЦІКАВА: МАЙГО СЫНА ЎЗЯЛІ ЗА ТВАР І КІНУЛІ Ў МАШЫНУ

Крысьціна Шацікава, грамадзкая актывістка з Магілёву, была сярод тых, хто прыйшоў падтрымаць Валерыя Шчукіна да будынку суду. Вось што адбылося са словаў Шацікавай:

Шацікава: Пад'ехала машына, мікрааўтобус, не міліцэйская... Падышлі міліцыянты і прапанавалі нам туды прайсьці. Мы адмовіліся, таму што ня бачылі, чаму мы павінны гэта рабіць. Тады далі загад усіх браць. Цяпер лета, таму дзеці са мной, а ня ў школе. І вось, тыя, хто пацярпеў, гэта дзьве дзяўчынкі непаўнагетнія – Багданава Алена і Міхайлава Крысьціна. Выклікалі хуткую дапамогу. У Алены Багданавай вельмі моцны цiск, у машыне ёй зрабілі ўкол.

Радыё Свабода: Колькі Алене Багданавай гадоў?

Шацікава: Семнаццаць.

Радыё Свабода: А што з Вашым сынам?

Шацікава: Яны вырвалі яго ў мяне з рук, узялі за твар і кінулі ў машыну...

Радыё Свабода: І пры гэтым ударылі галавой аб машыну?

Шацікава: Так.

Радыё Свабода: Што сказалі дактары? Зробленыя нейкія здымкі?

Шацікава: Так, у абласной клінічнай бальніцы Віцебску былі зробленыя здымкі. Дыягнаставалі шматлікія "ушыбы". Ад шпіталізацыі мы адмовіліся, бо пакінуць некага ў шпіталі, гэта тое самае, што ў турме.

*Радыё Свабода*

## РОДИЛИСЬ

11 июня
Рихард ШТРАУС (1864) немецкий композитор и дирижер, следовал немецким традициям романтизма, но в собственной манере, характеризуемой смелой, красочной оркестровкой. Вначале писал стильные поэмы, такие как "Дон Жуан" (1889), "Проделки Тиля Уленшпигеля" (1895). Затем перешел на создание опер - "Саломея" (1905) и "Электра" (1909), в которых использовал элементы политональности.

12 июня
Вячеслав ПОЛУНИН (1950) клоун-мим.

13 июня
Томас ЮНГ (1773) английский физик, врач и астроном, один из создателей волновой теории света. Его научные интересы были многообразны: оптика, механика, физиология зрения, филология. Он занимался расшифровкой египетских иероглифов, был хорошим музыкантом, знатоком живописи. Оптические наблюдения привели его к мысли, что господствовавшая в то время курпускулярная теория света неверна, и он высказался в пользу о поперечности световых колебаний. Он разработал теорию цветного зрения, основанную на предположении о существовании в сетчатке глаза 3-х родов чувтвительных волокон, реагирующих на 3 основных цвета. В 1807 он выпустил двухтомный труд «Курс лекций по натуральной философии и механическому искусству», где обобщил результаты своих работ по физической оптике. Он впервые рассмотрел механическую работу как величину, пропорциональную энергии, ввел термины «энергия», «физическая оптика».

14 июня
Гарриет БИЧЕР-СТОУ (1811-1.7.1896) американская писательница ("Хижина дяди Тома"). "Я теперь чувствую, что наступило время, когда даже женщина или ребенок, которые могут сказать хоть одно слово в защиту свободы и человечности, - должны говорить... Угрозы и позор, нависшие над нашей страной в данный момент, хуже, чем римское рабство, и я надеюсь, что ни одна женщина, умеющая писать, не будет молчать", - писала Бичер-Стоу редактору еженедельника "Нэшнл Ира", где впервые была напечатана ее книга. Опубликованная в 1851 году, "Хижина дяди Тома" стала событием в американской (да и не только) истории, манифестом борцов за отмену рабства. Не случайно президент США ЛИНКОЛЬН при встрече с писательницей воскликнул: "Так Вы - та самая маленькая женщина, написавшая книгу, из-за которой началась эта большая война?" В России роман вышел бесплатным приложением к первому номеру журнала "Современник" за 1858 год и был использован как оружие сторонниками отмены крепостного права.

15 июня
Рембрандт Харменс ван РЕЙН (1606) живописец.

16 июня
Жан ПЕЖО (1896-18.11.1966) французский автопромышленник

17 июня
Тигран Вартанович ПЕТРОСЯН (1929-14.8.1984) 9-й чемпион мира по шахматам.

# ПОНЕДЕЛЬНИК, 11 ИЮНЯ

### 1-ЫЙ

